Я.Р. Самуйлік, М.У. Красікава
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія"

## Марфалагічныя адметнасці гаворкі вёскі Чарняны Маларыцкага раёна

Вёска Чарняны размешчана на рацэ Асіпоўка, за 23 км ад раённага цэнтра г. Маларыта. Першае ўпамінанне пра паселішча ў пісьмовых крыніцах адносіцца да XVI ст. Згодна з інвентаром 1566 года Чарняны – гэта сяло Дарапеевіцкага войтаўства Палескай воласці Берасцейскага староства. Паводле легенды тут знаходзілася шкляная гута, на якой працавалі "чорныя людзі" ці "чэрнь" (адсюль і назва паселішча). У 2005 г. у вёсцы налічвалася 748 жыхароў і 289 гаспадарак [1, с. 359–361; 2, с. 531].

Дыялектны матэрыял у в. Чарняны (мясц. назва: Черн'а4ны; жыхары: черн'а4нец, черн'а4нка, черн'а4нцы) быў запісаны ў лютым-красавіку 2012 г. ад мясцовых жыхароў Стрэйчук Вольгі Рыгораўны, 1935 г. нараджэння, і Кулічыка Фёдара Мікалаевіча, 1947 г. нараджэння. Для запісу дыялектнага матэрыялу намі была выкарыстана праграма лінгвістычнага атласа "Гаворкі Выганаўскага Палесся. Фанетыка. Марфалогія. Лексіка" (дапрацаваны варыянт), а таксама т.зв. новая праграма: "Як у вас гавораць?" [3, с. 14–18].

Вакалізму дадзенай гаворкі ўласцівы такія адметнасці, як пяціфанемны склад галосных гукаў – [а], [е], [о], [ы(і)], [у]; рэалізацыя галоснага верхняга пад'ёму сярэдняга рада [и] (сярэдні паміж гукамі, што абазначаюцца літарамі і і ы) пасля цвёрдых зычных пераважна ў наступных пазіцыях: на месцы гістарычнага націскнога *һ, на месцы этымалагічнага *о ў новых закрытых складах пад націскам або вымаўленне ў падобных умовах галоснага [і] пасля мяккіх зычных (т.зв. і к а в і з м); пашырэнне гука [ы] на месцы гістарычных *е, *һ ў першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных; наяўнасць галосных [ы], [е] на месцы этымалагічнага *е (ь) у першым пераднаціскным складзе пасля гістарычных *с, *з, *т, *н, *д; рэалізацыя гука [а] на месцы этымалагічнага *ę ў пераднаціскных складах і інш.; кансанантызму – такія асаблівасці, як вымаўленне толькі цвёрдых зычных у наступных умовах: губныя цвёрдыя перад гістарычнымі *е /ва ўсіх пазіцыях/, *һ /у ненаціскных складах/, *і; этымалагічныя *с, *з, *т, *н, *д, *л – перад гістарычнымі *е (*ь), *і; ацвярдзенне этымалагічных "паўмяккіх" *д', *т' перад *е, *і, захаванне гістарычных мяккіх *д', *т' перад націскным *һ і на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку; захаванне цвёрдых заднеязычных у этымалагічных спалучэннях *гы, *кы, *хы, а таксама ў пазіцыі перад галосным [е] ў прыметніках ніякага роду адзіночнага ліку; наяўнасць цвёрдых і мяккіх гістарычных *р, *ж, *ш, *ч, *ц у пэўных пазіцыях; рэалізацыя губна-зубнога [v] (< *в, *л) у пазіцыі перад галосным, пасля галоснага гука перад зычным і ў канцавым становішчы, а таксама ў пачатковым становішчы перад зычнымі; наяўнасць фарынгальнага (глотачнага) зычнага [һ]; даволі выразнае вымаўленне звонкіх зычных у канцы слова, а таксама непаслядоўнае захаванне гэтых зычных у сярэдзіне слова перад глухімі; адсутнасць у пераважнай большасці слоў перад галоснымі [о], [у] пратэтычных зычных і інш. [4, кк. 5, 6, 34, 35, 42, 45–48, 52, 53, 55–57, 156; 5, с. 32, 151–152, 153; 6, с. 218].

Разгледзім найбольш яркія і істотныя марфалагічныя адметнасці даследуемай гаворкі.

Назоўнікі мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне адзначаны з канчаткамі -ом, -ем: кон'о4м, рубл'о4м, ноже4м, йайце4м.

Назоўнікам жаночага і мужчынскага роду адзіночнага ліку першага і другога скланенняў з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне ўласцівы канчатак -і: на меж'і4, на дvор'і4, на конц'і4 [4, кк. 68, 76, 77].

Назоўнікі жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланенняў з цвёрдай і мяккай асновай ў месным склоне пашыраны з канчаткамі -ы, -и, -оvы: v ха4ты, v л'і4сы, v по4лы, v по4ли, v но4си, по л'о4доvы [4, к. 18].

Формы клічнага склону агульных назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку зафіксаваны з канчаткамі -а, -о, уласных імёнаў – з канчаткам -о: ба4ба, ма4ма; ма4мо, Vа4л'о, На4д'о, Ма4н'о [4, к. 94].

Назоўнікам жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне характэрны нулявы канчатак: ныма4 баб, һоlо4v, йам, хат, доро4һ, стрих [4, к. 101].

У назоўным склоне мужчынскага роду адзіночнага ліку прыметнікі вымаўляюцца з націскным і ненаціскным канчаткам -ый: молоды4й, малы4й, стары4й; до4брый, но4vый, хоро4шый [4, кк. 110, 111].

Яркая і паказальная асаблівасць прыметнікаў вывучаемай гаворкі – гэта т.зв. "сцягнутыя" аднаскладовыя ненаціскныя канчаткі -а, -е ў назоўным склоне адзіночнага ліку жаночага і ніякага роду: до4бра, но4vа, но4vе, соло4дке, хоро4ше. Аднак пад націскам прыметнікі ў акрэсленых пазіцыях выступаюць тут з поўнымі двухскладовымі канчаткамі -айа, -ойе: молода4йа, стара4йа, молодо4йе, старо4йе [4, кк. 112–114].

Яшчэ адной значнай адметнасцю прыметнікаў гэтай гаворкі з'яўляюцца суфіксы -ч-, -ш- вышэйшай ступені параўнання: ду4жчы, доро4шчы, ши4рши [4, к. 130; 7, с. 96–97].

Інфінітыў дзеясловаў з асновай на галосны адзначаны з фанематычным варыянтам старажытнага суфікса -ц'і -ты: ходы4ты, робы4ты, спа4ты [4, к. 173].

Дзеясловам першага і другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку ўласцівы канчаткі -е, -ыт', -ут', -ат': vин, v'ін іде4, нысе4, хо4дыт', но4сыт', vоны4 іду4т', несу4т', хо4д'ат', но4с'ат' і інш. [4, кк. 148, 156].

Зваротныя дзеясловы пашыраны з постфіксамі -с'а, с': бра4тыс'а, зvа4тыс'а, мы4тыс'а, vмыvа4тыс'а, робы4тыс'а, бойу4с', купа4йус', бойа4vс', купа4vс', н'ішо4с' зробы4лос' і інш. [4, кк. 164, 165].

І нарэшце, вылучаецца дадзеная гаворка і тым, што дзеясловы ў форме інфінітыва з асновай на [к] захоўваюць старажытную форму на -чы з націскам на канчатку: пычы4, сычы4. Дзеясловы ж з асновай на [һ] у акрэсленай граматычнай форме аднаўляюць гэты зычны: стры4һчы. Аднак ў форме трэцяй асобы множнага ліку цяперашняга часу падобныя дзеясловы паслядоўна захоўваюць зычныя [к], [һ]: пеку4т', секу4т', стрыһу4т' [4, кк. 158, 178, 179; 8, с. 316–318].

Разгледзім яшчэ шэраг найбольш выразных і істотных асаблівасцей даследуемай гаворкі. Назоўнік гру4дзі ў творным склоне зафіксаваны з канчаткам -ыма: болы4т' пуд һруды4ма. Назоўнік множнага ліку чо4баты [боты] у месным склоне ўжываюцца з ненаціскным канчаткам -ах: у чо4батах. Асабова-ўказальныя займеннікі трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку ён, яна4, яно4, яны4, ўласна-асабовы займеннік другой асобы множнага ліку вы, няпэўны займеннік не4шта, а таксама займеннік, злучнік і часціца што выступаюць у своеасаблівых лексіка-граматычных формах: vин, v'ін, vона4, vоно4, vоны4; v'і4те; н'ішо4с'; шчо [4, кк. 38, 133]. Зваротны дзеяслоў смяя4цца ў трэцяй асобе адзіночнага ліку адзначаны з фанематычным варыянтам: vин смыйе4ц'ц'а. У выразе я лью ваду4 дзеяслоў ліць у першай асобе адзіночнага ліку мае наступную форму: йа л'л'у vо4ду.

Такім чынам, гаворка в. Чарняны Пружанскага раёна характарызуецца значнай колькасцю моўных асаблівасцей і адносіцца да сярэднезагародскіх гаворак, аднаго з чатырох тыпаў (разнавіднасцяў) заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак [5, с. 150–157, 201–214; 6, с. 218; 9, с. 22–24, 38–39].

ЛІТАРАТУРА:

1. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя – Т. 4, кн. ІІ. Брэсцкая вобласць / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2007. – 608 с.: іл.

2. Памяць : Маларыц. р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэд.-уклад. В.Р. Феранц ; рэдкал.: Я.В. Малашэвіч [і інш.]. – Мінск : Ураджай, 1998. – 535 с., [8] л. іл.

3. Самуйлік, Я.Р. Гаворкі Выганаўскага Палесся : лінгвіст. атлас для студэнтаў філал. фак. ун-та / Я.Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст : БрДУ, 2009. – 199 с.

4. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы / Р.І. Аванесаў [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад рэд. Р.І. Аванесава. – Мінск : АН БССР, 1963. – [2] с., VIII, 338 к.

5. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы : дапам. для філал. спецыяльнасцей ВНУ / А.А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 293 с.

6. Клімчук, Ф.Д. Заходнепалескія гаворкі / Ф.Д. Клімчук // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 218–219.

7. Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапам. / Э.Д. Блінава, Е.С. Мяцельская. – 2-е выд., дапрац. і дап. - Мінск : Выш. шк., 1980. – 303 с.
8. Булыка, А.М. Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко. - Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 328 с.
9. Клімчук, Ф.Д. Гаворкі Заходняга Палесся: фанетычны нарыс / Ф.Д. Клімчук ; [рэд. М.І. Талстой] ; Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства. - Мінск : Навука і тэхніка, 1983. - 126 с.